**Установа адукацыі**
**«Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны»**

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
ГДУ імя Ф.Скарыны
________________ І.В. Семчанка
________________2017

Рэгістрацыйны № УД-______/вуч.

# НАЦЫЯНАЛЬНА-РЭЛІГІЙНАЯ ПАЛІТЫКА РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў БЕЛАРУСІ (ДРУГАЯ ПАЛОВА XIX – ПАЧАТАК XX СТ.)

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
першай ступені па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:
1-21 03 01-01 гісторыя (айчынная і ўсеагульная)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2017 г.

Вучэбная праграма ўкладзена на падставе Адукацыйнага стандарта 1-21 03 01-2013 «Вышэйшая адукацыя. Першая ступень. Спецыяльнасць 1-21 03 01 гісторыя (па напрамках)» ; вучэбнага плана па спецыяльнасці 1-21 03 01-01 Гісторыя (айчынная і ўсеагульная) Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны рэгістрацыйны № D 21-05-13, дата зацвярджэння 29.08.2013.

**УКЛАДАЛЬНІК:**
В.А.МІХЕДЗЬКА, дацэнт кафедры гісторыі Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
С.А.ЕЛІЗАРАЎ, прафесар кафедры сацыяльна-гуманітарных і прававых дысцыплын ГДТУ імя П.В.Сухога, доктар гістарычных навук, дацэнт;
А.М.БАБКОЎ, дацэнт кафедры ўсеагульнай гісторыі ГДУ імя Ф. Скарыны, кандыдат гістарычных навук, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай гісторыі Беларусі ГДУ імя Ф.Скараны
(пратакол №10 ад 10.04.2017)

Навукова-метадычным саветам ГДУ імя Ф.Скарыны
(пратакол № 8 ад 07.06.2017)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць дысцыпліны кампанента установы вышэйшай адукацыі «Нацыянальна-рэлігійная палітыка Расійскай імперыі ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.)» абумоўлена асаблівай значнасцю перыяда для Беларусі. Гэты перыяд першым чынам ахарактарызаваўся афармленнем паліканфесійнай беларускай нацыі. У той жа час беларускія тэрыторыі засялялі і іншыя этнічныя і конфесійныя супольнасці, якія адчувалі на сябе значнае ўздзеянне нацыянальна-рэлігійнай палітыкі, якая ажыццяўлялася тут расійскім самадзяржаўем. Разгляд гэтай праблематыкі ўяўляе адзін з найбольш актуальных накірункаў сучасных даследаванні айчыннай гісторыі.

**Мэтай** дысцыпліны з'яўляецца фарміраванне ў студэнтаў ведаў пра этапы і накірункі эвалюцыі, важнейшыя мерапрыемствы нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў дачыненні да асноўных этнаканфесійных супольнасцяў края на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст.

**Задачамі** дысцыпліны з'яўляюцца:

засваенне гістарычных фактаў, падзей і працэсаў, якія вызначалі нацыянальна-рэлігійнае становішча Беларусі на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст.;

азнаямленне з найбольш актуальнымі для грамадства беларускага краю праблемамі нацыянальна-рэлігійнага жыцця;

авалоданне паняційным апаратам;

выхаванне грамадзянскай пазіцыі, патрыятызму, рэлігійнай талеранцыі.

У адпаведнасці з Адукацыйным стандартам студэнт павінны авалодаць наступнымі кампетэнцыямі:

<u>акадэмічнымі:</u>

АК-1. Умець ужываць базавыя навукова-тэарэтычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач.

АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

<u>сацыяльна-асобаснымі:</u>

СЛК-7. Быць здольным да самастойнага навучання.

СЛК-8. Умець фармаваць уласныя меркаванні.

СЛК-9. Быць здольным ужываць атрыманыя веды.

У выніку вывучэння дысцыпліны **студэнт павінен ведаць**:

асноўныя крыніцы і навуковыя даследаванні па праблемах этнаканфесійнай гісторыі Беларусі.

асноўныя этапы і накірункі нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі на працягу другой паловы XIX – пачатку XX ст.;

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

асноўныя этапы імерапрыемствы нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ў дачыненні да асноўных нацыянальных і этнаканфесійных супольнасцей Беларусі.

У выніку вывучэння дысцыпліны спецыялізацыі студэнты павінны ўмець:

ужываць атрыманыя веды для вырашэння канкрэтных педагагічных, метадычных, інфармацыйна-пошукавых, навуковых інавацыйных і іншых задач;

даваць самастойныя ацэнкі, рэферыраваць навуковыя работы па нацыянальна-рэлігійнай праблематыцы гісторыі Беларусі другой паловы XIX – пачатка XX ст.;

выяўляць і крытычна ацэньваць сутнасць асноўных з’яў і працэсаў у гісторыі дзяржаў рэгіёна;

знаходзіць агульнае і асаблівае ў развіцці дзяржаў і грамадстваў Усходняй Еўропы, Закаўказзя і Цэнтральнай Азіі.

Дысцыпліна «Нацыянальна-рэлігійная палітыка Расійскай імперыі ў Беларусі (другая палова XIX – пачатак XX ст.)» абапіраецца на веды, атрыманыя студэнтамі пры вывучэнні такіх дасцыплін, як «Гісторыя Беларусі», «Гістарыяграфія гісторыі Беларусі», «Крыніцазнаўства гісторыі Беларусі». Дысцыпліна вывучаецца студэнтамі спецыяльнасці 1-21 03 01-01 гісторыя (айчынная і ўсеагульная). Дзённая форма навучання – у аб’ёме – 124 гадзіны; аўдыторная колькасць гадзін – 41, з іх: лекцыі – 22, семінарскія заняткі – 16, КСР – 10 гадзін, форма кантролю – залік (8 семестр). Завочная форма навучання – 8 гадзін лекцый, 2 гадзіны практычных заняткаў, залік (9 семестр).

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛА

**Тэма1. Прадмет і задачы дысцыпліны. Гістарыяграфічнае вывучэнне ў 20- 80 –я гг. ХХ ст. нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**

Асноўныя этапы вывучэння нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі на Беларусі. Гістарыяграфія 20-30 гг. ХХ ст.: Ф. Турук, А.І. Луцкевіч, З.Жылуновіч, М. Доўнар-Запольскі., А. Цвікевіч, С. Агурскі і інш. Абмежаванасць аспектаў даследаванняў у 20-30гг. Гістарыяграфія праблемы 50-х першай паловы 80-х гг. ХХ ст. Беларуская савецкая гістарыяграфія нацыянальнай плітыкі царызма С. М. Самбук. М.В. Біч і ягоны ўклад у вывучэнне нацыянальных працэсаў у Беларусі пачатку ХХ ст.

**Тэма 2. Сучасная гістарыграфія нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**

Пашырэнне спектра даследаванняў этнаканфесійнай праблематыкі ў другой палове 80-х г. ХХ ст. – пачатку ХХІ ст. Вывучэнне беларускага нацыянальнага-культурнага. Вывучэнне польскага грамадска-палітычнага руха ў Беларусі. А.Ф. Смалянчук. Яўрэйская грамада Беларусі ў сучасных даследваннях. Ю. Функ, І. Герасімава. Рэлігійная праблематыка у асвятленні А.Філатавай, В. В.Яноўскай, А. Ю.. Бендзіна.

Асвятленне праблем нацыянальнага развіцця і рэлігійнага становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі у даследаваннях замежных і сучасных расійскіх гісторыкаў: А.Капэлер, Т.Ўікс, Д.Сталюнас, Ю. Бардах, Р. Радзік, Л. Гарызонтаў. Дыскусія аб сутнасці і формах русіфікацыйнай палітыкі у «Заходнім краі» Расійскай імперыі А.І. Міллер, А.А. Камзолава, М. Дз. Далбілаў.

**Тэма 3. Крыніцы вывучэння нацыянальна-рэлігійнага становішча Беларусі другой паловы XIX - пачатку XX ст.**

Заканадаўчыя крыніцы, іх публікацыі. Асаблівасці ўзаемадзеяння законаў і падзаконных актаў, ведамасных інструкцый у беларускіх губернях ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

Справаводчая дакументацыя. Матэрыялы канцылярый губернатараў. Справаздачы віленскіх генерал-губернатараў і губернатараў. Стэнаграфічныя справаздачы Дзяржаўных дум Расійскай імперыі як крыніца па вывучэнні нацыянальна-рэлігійнай палітыкі ў Беларусі..

Статыстычныя матэрыялы: матэрыялы Першага Ўсерасійскага перапісу 1897г. Мемуарныя крыніцы. Публіцыстыка, матэрыялы перыядычнага друку.

Асноўныя публікацыі крыніц іх асаблівасці.

**Тэма 4. Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і прававое становішча Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ў складзе Расійскай імперыі.**

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: Віленскае генерал-губернатарства, губерні. Генерал-губернатары, губернатары, губернская адміністрацыя. Назвы краю: Паўночна-Заходні край, Белоруссія, Літва. Паліканфесійны характар Беларусі. Хрысціянскія канфесіі ў Беларусі.

Мэты і сродкі дзяржаўнай палітыкі Расіі ў краі. М.Мураўёў і яго адміністрацыйная спадчына. Асабісты склад мясцовай адміністрацыі, крыніцы яго папаўнення. Сістэма “абмяжавальнага заканадаўства” і яе ўплыў на развіццё краю.

Эвалюцыя ўрадавага курса у канфесійнай сферы. Прапановы П.Д. Святаполка-Мірскага па лібералізацыі зместу і сродкаў дзяржаўнай этнаканфесійнай палітыкі ў краі: "Усепадданейшая справаздача" 20.05.1904г.

Палажэнне 17 красавіка 1905 г "Аб умацаванні верацяплівасці" (“Указ аб верацярплівасці”). П.А. Сталыпін і асаблівасці русіфікацыйнай палітыцы.

**Тэма 5 Рэлігія ў Расійскай імперыі як аб’ект кантролю і інструмент кіравання. Праваслаўная царква як дзяржаўная структура**.

Органы кантроля і кіравання рэлігійнай сферай. Сінод, Дэпартамент духоўных спраў. Этнаканфесійная праблематыка ў заканадаўстве імперыі: “Инородцы”; веравызнанні “терпимые” и “гонимые”. Прававое рэгуляванне рэлігійнага жыцця і дзейнасці, сямейныа-шлюбных адносін. Праваслаўная царква на тэрыторыі беларускіх губерняў. Царкоўна-прыходскія школы як інструмент русіфікацыйнай палітыкі і стрыжань русіфікацыйнай палітыцы. Праваслаўная царква і "западно-русская" ідэалогія.

**Тэма 6. Беларусы ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**

Спецыфіка беларускага нацыянальна-палітычнага развіцця пад уплывам абмежавальнага заканадаўства і дэфармацыі этнасацыяльнай структуры. Паліканфесійнасць беларускага этнасу: беларусы-праваслаўныя і беларусы-каталікі, спецыфіка самаідэнтыфікацыі.

Праблема этнічнай ідэнтыфікацыі беларусаў у расійскай адміністрацыі. Беларусы ва ўяўленнях расійскага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст. Беларускае пытанне ў разуменні мясцовай адміністрацыі. П.Д. Святаполк-Мірскі аб беларусах. Шматаблічнасць і разнастайнасць русіфікацыйных захадаў, русіфікацыя беларусаў. Дакладная нататка мінскага губернатара Гірса "Аб захадах, якія могуць умацаваць самасвядомасць беларусаў і супрацьдзейнічаць іх паланізацыі" (1914г.)

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Тэма 7. Палякі ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**

Праблема этнічнага і нацыянальнага вызначэння і самавызначэння польскага насельніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст. Польскасць і каталіцтва. Саслоўныя ідэнтыфікатары польскасці” шляхта. Асноўныя плыні польскага руху на беларускіх і літоўскіх землях на рубяжы XIX - XX ст. Краёвасць як палітыка-ідэалагічны і культурны феномен. М. Ромер, Э. Вайніловіч, Р. Скірмунт. Палітыка-арганізацыйная дыферэнцыяцыя польскага грамадства ў Беларусі. Польская грамадскасць і нацыянальна-культурнае Адраджэнне беларусаў і літоўцаў

Узмацненне антыпольскіх тэндэнцый дзейнасці расійскай адміністрацыі у 1906-1914г. і яго прычыны.

**Тэма 8. Каталіцкая царква пад кантролем расійскіх уладаў.**

Прапановы М.Мураўёва па абмежаванні ўплываў каталіцкай царквы ў Паўночна-Заходнім краі. “Распалячванне касцёла” і яго вынікі. “Абмежавальнае” расійскае заканадаўства ў дачыненні да каталіцкай царквы і вернікаў у сацыяяльна-эканамічнай сферы. Цыркуляр 1902 г. віленскага біскупа Ст. Звяровіча аб забароне вучэння дзяцей-каталікоў у праваслаўных царкоўна-прыходскіх школах і рэакцыя ўладаў. Віленскі біскуп Э. Фон Роп. Касцёл і беларускае нацыянальнае адраджэнне:

**Тэма 9. Нацыянальна-рэлігійнае становішча яўрэйскай грамады Беларусі.**

Яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці. Эвалюцыя дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да яўрэйскай грамады. Юдаізм у Беларусі: цэнтры рэлігійнай вучонасці, іх культурнае значэнне. Юдаізм у расійскім заканадаўстве і палітыцы мясцовай адміністрацыі. Узмацненне “абмежавальнага заканадаўства” ў дачыненні да яўрэяў у 80-х гг. XIX ст. “Часовыя правілы” 3 мая 1882 г. і іх уплыў на сацыякультурнае становішча яўрэйскага насельніцтва. Яўрэйская духоўная культура ў Беларусі ў пачатку XX ст.: рэлігійная традыцыя і мадэрнізацыя духоўнага жыцця.

Дыферэнцыяцыя яўрэйскага нацыянальнага руху: Палесцінафільства, духоўны сіянізм, палітычны сіянізм і яго адрозненні ад палесцінафільства, тэрытарялізм, аўтанамізм, сацыялізм. Сацыял-дэмакратычныя і нэанародніцкія яўрэйскія партыі і арганізацыі ў Беларусі. Дзяржаўны і пабытовы антысемітызм у Беларусі. “Протоколы сионских мудрецов”. Гомельскі (1903 г.) пагром і яго вынікі. Антыяўрэйскія пагромы ў Беларусі ў 1903-1906 гг. Пытанне аб удзеле адміністрацыі ў правакаванні і арганізацыі пагромаў.

**Тэма 10. Стараверы і іншыя “ганімыя” хрысціянскія супольнасці ў Беларусі ў кантэксце ўрадавай палітыкі**

Стараверска грамада ў Беларусі: этнакультурныя рысы, асаблівасці веравызнаўчай стратыфікацыі і геаграфічнага размеркавання. Заканадаўчае

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

абмежаванне веравызнаўчай сферы стараверaў. Змены у становішчы стараверaў пасля прыняцця “указа аб верацярплівасці”. Неапратэстанцкія супольнасці ў палітыцы расійскіх улад.

**Тэма 11 Мусульманская грамада Беларусі**

Мусульманскае насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці, тэрытарыяльнае размеркаванне. Эвалюцыя дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да мусульманскай грамады ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА (дзённая форма навучання)

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў; пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аўдыторных гадзін | | | | КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | Інш. | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | **Прадмет і задачы дысцыпліны. Гістарыяграфічнае вывучэнне ў 20- 80 –я гг. ХХ ст. нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**<br>1 Прадмет і задачы дысцыпліны.<br>2 Гістарыяграфія 20-30 гг. ХХ ст.:<br>3 Гістарыяграфія праблемы 50-х– першай паловы 80-х гг. ХХст. | 2 | - | - | | | |
| 2. | **Сучасная гістарыграфія нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**<br>1 Беларускі нацыянальнага-культурны рух у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі<br>2 Вывучэнне польскага грамадска-палітычнага руха ў Беларусі. Яўрэйская грамада Беларусі ў сучасных даследваннях.<br>3 Рэлігійная праблематыка у у сучаснай гістарыяграфіі<br>4 Нацыянальнае развіццё і рэлігійнаае становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі у даследаваннях замежных і сучасных расійскіх гісторыкаў: | 2 | 2 | - | | 2 | рэферат |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3. | **Крыніцы вывучэння нацыянальна-рэлігійнага становішча Беларусі другой паловы XIX - пачатку XX ст.**<br>1 Заканадаўчыя крыніцы, іх публікацыі.<br>2 Справаводчая дакументацыя.<br>3 Статыстычныя матэрыялы: матэрыялы<br>4 Мемуарныя крыніцы. Публіцыстыка, матэрыялы перыядычнага друку. | 2 | - | | | | |
| 4. | **Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і прававое становішча Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ў складзе Расійскай імперыі**.<br>1 Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.<br>2 М.Мураўёў і яго адміністрацыйная спадчына. .Структура і склад мясцовай адміністрацыі.<br>3 Паліканфесійны характар Беларусі. Хрысціянскія канфесіі ў Беларусі.<br>4 Палажэнне 17 красавіка 1905 г "Аб умацаванні верацяплівасці" П.А. Сталыпін і асаблівасці русіфікацыйнай палітыцы | 2 | 2 | - | | 2 | рэферат |
| 5. | **Рэлігія ў Расійскай імперыі як аб’ект кантролю і інструмент кіравання. Праваслаўная царква як дзяржаўная структура.**<br>Органы кантроля і кіравання рэлігійнай сферай.<br>Этнаканфесійная праблематыка ў заканадаўстве імперыі: Праваслаўная царква на тэрыторыі беларускіх губерняў.<br>Праваслаўная царква і "западно-русская" ідэалогія. | 2 | 2- | - | | | |
| 6 | **Беларусы ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**<br>1 Праблема этнічнай ідэнтыфікацыі беларусаў у расійскай адміністрацыі.<br>2 Беларусы ва ўяўленнях расійскага грамадства ў другой палове XIX | 2 | 2 | | | 2 | рэферат |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | – пачатку XX ст.<br>3 Беларускае пытанне ў разуменні мясцовай адміністрацыі | | | | | | |
| 7 | **Палякі ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**<br>1 Праблема этнічнага і нацыянальнага вызначэння і самавызначэння польскага насельніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст.<br>2 Краёвасць як палітыка-ідэалагічны і культурны феномен.<br>3 Узмацненне антыпольскіх тэндэнцый дзейнасці расійскай адміністрацыі у 1906-1914г. і яго прычыны. | 2 | 2 | | | 2 | рэферат |
| 8 | **Каталіцкая царква пад кантролем расійскіх уладаў.**<br>1 Прапановы М.Мураўёва па абмежаванні ўплываў каталіцкай царквы ў Паўночна-Заходнім краі.<br>2 “Распалячванне касцёла” і яго вынікі.<br>3 “Абмежавальнае” расійскае заканадаўства ў дачыненні да каталіцкай царквы і вернікаў у сацыяльна-эканамічнай сферы. Касцёл і беларускае нацыянальнае адраджэнне: | 2 | 2 | | | | |
| 9 | **Нацыянальна-рэлігійнае становішча яўрэйскай грамады Беларусі.**<br>1 Яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці.<br>2 Узмацненне “абмежавальнага заканадаўства” ў дачыненні да яўрэяў у 80-х гг. XIX ст. “Часовыя правілы” 3 мая 1882 г. Яўрэйская духоўная культура ў Беларусі ў пачатку XX ст.: рэлігійная традыцыя і мадэрнізацыя духоўнага жыцця.<br>3 Дыферэнцыяцыя яўрэйскага нацыянальнага руху: | 2 | 2 | | | 2 | рэферат |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 10 | **Стараверы і іншыя “ганімыя” хрысціянскія супольнасці ў Беларусі ў кантэксце ўрадавай палітыкі**<br>1 Староверская грамада ў Беларусі: этнакультурныя рысы<br>2 Заканадаўчае абмежаванне веравызнаўчай сферы старавераў.<br>3 Змены у становішчы старавераў пасля прыняцця “указа аб верацярплівасці”.<br>4 Неапратэстанцкія супольнасці ў палітыцы расійскіх улад. | 2 | 2 | | | | |
| 11 | **Мусульманская грамада Беларусі**<br>1 Мусульманскае насельніцтва Беларусі і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці,<br>2 Эвалюцыя дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да мусульманскай грамады ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | 2 | | | | | |
| | **Усяго:** | 22 | 16 | | | 10 | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА (завочная форма навучання)

| Нумар раздзела, тэмы, заняткаў | Назва раздзела, тэмы, заняткаў;<br>пералік вывучаемых пытанняў | Колькасць аудыторных гадзін | | | | КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | лекцыі | практычныя (семінарскія) заняткі | лабараторныя заняткі | Іншы. | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| 1. | **Прадмет і задачы дысцыпліны. Гістарыяграфічнае вывучэнне ў 20- 80 –я гг. XX ст. нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**<br>4 Прадмет і задачы дысцыпліны.<br>5 Гістарыяграфія 20-30 гг. XX ст.:<br>6 Гістарыяграфія праблемы 50-х– першай паловы 80-х гг. XXст. | 2 | - | - | | | |
| 2. | **Сучасная гістарыграфія нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.**<br>5 Беларускі нацыянальнага-культурны рух у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі<br>6 Вывучэнне польскага грамадска-палітычнага руха ў Беларусі. Яўрэйская грамада Беларусі ў сучасных даследваннях.<br>7 Рэлігійная праблематыка у у сучаснай гістарыяграфіі<br>8 Нацыянальнае развіццё і рэлігійнаае становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі у даследаваннях замежных і сучасных расійскіх гісторыкаў: | - | - | - | | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 3. | **Крыніцы вывучэння нацыянальна-рэлігійнага становішча Беларусі другой паловы XIX - пачатку XX ст.**<br>5 Заканадаўчыя крыніцы, іх публікацыі.<br>6 Справаводчая дакументацыя.<br>7 Статыстычныя матэрыялы: матэрыялы<br>8 Мемуарныя крыніцы. Публіцыстыка, матэрыялы перыядычнага друку. | - | - | | | | |
| 4. | **Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і прававое становішча Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ў складзе Расійскай імперыі**.<br>5 Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.<br>6 М.Мураўёў і яго адміністрацыйная спадчына. .Структура і склад мясцовай адміністрацыі.<br>7 Паліканфесійны характар Беларусі. Хрысціянскія канфесіі ў Беларусі.<br>8 Палажэнне 17 красавіка 1905 г "Аб умацаванні верацяплівасці" П.А. Сталыпін і асаблівасці русіфікацыйнай палітыцы | - | - | - | | 2 | |
| 5. | **Рэлігія ў Расійскай імперыі як аб’ект кантролю і інструмент кіравання. Праваслаўная царква як дзяржаўная структура.**<br>Органы кантроля і кіравання рэлігійнай сферай.<br>Этнаканфесійная праблематыка ў заканадаўстве імперыі: Праваслаўная царква на тэрыторыі беларускіх губерняў.<br>Праваслаўная царква і "западно-русская" ідэалогія. | 2 | - | - | | | |
| 6 | **Беларусы ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**<br>4 Праблема этнічнай ідэнтыфікацыі беларусаў у расійскай адміністрацыі.<br>5 Беларусы ва ўяўленнях расійскага грамадства ў другой палове XIX | - | - | | | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | – пачатку XX ст.<br>6 Беларускае пытанне ў разуменні мясцовай адміністрацыі | | | | | | |
| 7 | **Палякі ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.**<br>4 Праблема этнічнага і нацыянальнага вызначэння і самавызначэння польскага насельніцтва ў Беларусі ў другой палове XIX - пачатку XX ст.<br>5 Краёвасць як палітыка-ідэалагічны і культурны феномен.<br>6 Узмацненне антыпольскіх тэндэнцый дзейнасці расійскай адміністрацыі у 1906-1914г. і яго прычыны. | 2 | - | | | 2 | |
| 8 | **Каталіцкая царква пад кантролем расійскіх уладаў.**<br>4 Прапановы М.Мураўёва па абмежаванні ўплываў каталіцкай царквы ў Паўночна-Заходнім краі.<br>5 “Распалячванне касцёла” і яго вынікі.<br>6 “Абмежавальнае” расійскае заканадаўства ў дачыненні да каталіцкай царквы і вернікаў у сацыяльна-эканамічнай сферы. Касцёл і беларускае нацыянальнае адраджэнне: | - | - | | | | |
| 9 | **Нацыянальна-рэлігійнае становішча яўрэйскай грамады Беларусі**.<br>4 Яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці.<br>5 Узмацненне “абмежавальнага заканадаўства” ў дачыненні да яўрэяў у 80-х гг. XIX ст. “Часовыя правілы” 3 мая 1882 г. Яўрэйская духоўная культура ў Беларусі ў пачатку XX ст.: рэлігійная традыцыя і мадэрнізацыя духоўнага жыцця.<br>6 Дыферэнцыяцыя яўрэйскага нацыянальнага руху: | 2 | - | | | 2 | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 10 | **Старавееры і іншыя “ганімыя” хрысціянскія супольнасці ў Беларусі ў кантэксце ўрадавай палітыкі**<br>5 Стараверская грамада ў Беларусі: этнакультурныя рысы<br>6 Заканадаўчае абмежаванне веравызнаўчай сферы стараверaў.<br>7 Змены у становішчы старавераў пасля прыняцця “указа аб верацярплівасці”.<br>8 Неапратэстанцкія супольнасці ў палітыцы расійскіх улад. | - | - | | | | |
| 11 | **Мусульманская грамада Беларусі**<br>3 Мусульманскае насельніцтва Беларусі і яго этнакультурныя і рэлігійныя асаблівасці,<br>4 Эвалюцыя дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да мусульманскай грамады ў другой палове XIX – пачатку XX ст. | - | | | | | |
| | **Усяго:** | 8 | 2 | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Прыкладны пералік семінараў

1 Сучасная гістарыграфія нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.
2 Тэрытарыяльна-адміністрацыйнае і прававое становішча Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. ў складзе Расійскай імперыі.
3 Рэлігія ў Расійскай імперыі як аб'ект кантролю і інструмент кіравання. Праваслаўная царква як дзяржаўная структура.
4 Беларусы ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.
5 Палякі ў сістэме нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі.
6 Каталіцкая царква пад кантролем расійскіх уладаў.
7 Нацыянальна-рэлігійнае становішча яўрэйскай грамады Беларусі.
8 Стараверы і іншыя "ганімыя" хрысціянскія супольнасці ў Беларусі ў кантэксце ўрадавай палітыкі
9 Мусульманская грамада Беларусі

### Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў

Рэфератыўная работа.

### Рэкамендаваныя тэмы рэфератыўных работ

1 Сучасная гістарыграфія нацыянальна-рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі ў Беларусі.
2 Беларускі нацыянальнага-культурны рух у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі
3 Вывучэнне польскага грамадска-палітычнага руха ў Беларусі. Яўрэйская грамада Беларусі ў сучасных даследваннях.
4 Рэлігійная праблематыка у у сучаснай гістарыяграфіі
5 Нацыянальнае развіццё і рэлігійнаае становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі у даследаваннях замежных гісторыкаў.
6 Нацыянальнае развіццё і рэлігійнаае становішча Беларусі ў складзе Расійскай імперыі у даследаваннях сучасных расійскіх гісторыкаў.
7 Тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел Беларусі ў складзе Расійскай імперыі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
8 М.Мураўёў і яго адміністрацыйная спадчына. .Структура і склад мясцовай адміністрацыі.
9 Паліканфесійны характар Беларусі. Хрысціянскія канфесіі ў Беларусі.
10 Палажэнне 17 красавіка 1905 г "Аб умацаванні верацяплівасці" П.А. Сталыпін і асаблівасці русіфікацыйнай палітыцы

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

11 Органы кантроля і кіравання рэлігійнай сферай ў другой палове XIX – пачатку XX ст.
12 Этнаканфесійная праблематыка ў заканадаўстве імперыі: Праваслаўная царква на тэрыторыі беларускіх губерняў.
13 Стараверская грамада ў Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.: этнакультурныя рысы
14 Заканадаўчае абмежаванне веравызнаўчай сферы старавераў.
15 Змены у становішчы старавераў пасля прыняцця “указа аб верацярплівасці”.
16 Неапратэстанцкія супольнасці Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст.

## Рэкамендаваная літаратура

*Асноўная*


1. "Всеподданейший отчет...- виленского, гродненского и ковенского генерал-губернатора П.Д.Святополка-Мирского Николаю II // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – №2. – С.94 – 116.
2. Біч, М..В. Нацыянальны склад прамысловага пралетарыяту Беларусі ў канцы XIX - пачатку XX ст. / М..В Біч //Весці Акадэміі навук Беларускай ССР. Сер. грамадскіх навук. – 1972. – № 4. – С.34 - 40.
3. Ганчар, А.И.Римско-католическая церковь в Беларуси (вт. пол. XIX – нач. XX вв.). Исторический очерк : монография /А.И. Ганчар. – Гродно : ГГАУ, 2010. – 510 с.
4. Гарбацкі, А. А. Стараабраднiцтва на Беларусі ў канцы XVII — пачатку XX ст. / А. А. Гарбацкі. Брэст: Выд-ва Брэсцкага дзярж. ун-та, 1999. – 200 с.
5. Долбилов М.Д. Русский край, чужая вера: Этноконфессиональная политика империи в Литве и Белоруссии при Александре II / М.Д. Долбилов. – М.: Новое литературное обозрение, 2010. – 1000 с.
6. Думін, С. У. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць/ С. У. Думін, І. Б напацкі. – Мінск, 1993.
7. Западные окраины Российской империи. – М.: Новое литературное обозрение, 2007. - 608 с.
8. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII—XX ст.) / В.В.Грыгор’ева, У.М.Завальнюк, У.І.Навіцкі, А.М. Філатава. Навук. рэд. У.І.Навіцкі. – Мінск: ВП „Экаперспектыва“, 1998. – 340 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

9. Миллер, А. Империя Романовых и национализм / А. Миллер.– М.: Новое литературное обозрение, 2006. – 248с.
10. Смалянчук, А.Ф. Паміж краёвасцю і нацыянальнай ідэяй. Польскі рух на беларускіх і літоўскіх землях. 1864 – люты 1917 г. / А.Ф. Смалянчук, Санкт-Пецярбург: Неўскі прасцяг, 2004.– 402 с.
11. Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX - начала XX в.: В контексте Центрально-Восточной Европы / П. В.Терешкович. – Минск: БГУ, 2004. – 223 с.
12. Трацяк, І. І. Беларускае каталіцкае духавенства ля вытокаў сацыякультурнай ідэнтыфікацыі: манагр. / І.І.Трацяк. Гродна: ГрДУ, 2013. – 267 с.
13. Цвікевіч, А. "Западно-руссизм": Нарысы з гісторыі грамадскай мыслі на Беларусі ў XIX і пачатку XX вв . / А. Цвікевіч. – Мінск, Навука і тэхніка, 1993. – 352 с.
14. Четыре политические записки графа Михаила Николаевича Муравьева виленского // Русский архив. – 1885. – № 6. – С. 160–202.
15. Эберхардт, П. Дэмаграфічная сітуацыя на Беларусі. 1898 – 1989 / П. Эберхардт. – Берасьце: Беларускі фонд Сораса, 1997. – 282 с.
16. Яноўская, В. Узаемаадносіны «царква–дзяржава» ў Расейскай імперыі на пачатку XX ст. / В. Яноўская // Гістарычны альманах. – Гародня, 2002. – Т. 6. – С. 117–129.
17. Яноўская, В.В. Моўнае пытанне ў Рымска-каталіцкім касцёле Беларусі (60-я гг. XIX — пачатак XX ст.): славянская и літоўская гістарыяграфія / В.В. Яноўская // Российские и славянские исследования: науч. сб.Вып. / редкол.: А. П. Сальков, О. А. Яновский (отв. редакторы) [и др.]. – Минск : БГУ, 2007. – С. 152–162.
18. Яноўская, В.В. Хрысціянская царква ў Беларусі 1863–1914 гг. / В.В.Яноўская. – Мінск: БДУ, 2002. – 199 с.

*Дадатковая*

19. Бендин, А. Ю. Проблемы веротерпимости в Северо-Западном крае Российской империи (1863—1914 гг.) / А. Ю.. Бендин,– Минск: Белорусский государственный университет, 2010. – 439 с.
20. Бядуля, З. Жыды на Беларусі. Бытавыя штрыхі / З. Бядуля // Arche. – 2000. – №3 – с.23 – 33.
21. Верашчагіна, А. У. Гісторыя кан-фесій у Беларусі: мінулае і сучаснасць / А. У. Верашчагіна, А. В. Гурко. – Мінск: Тэхналогія, 2000.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

22. Викс, Т. Р. "Мы" или "они"? Белорусы и официальная Россия, 1863–1914 / Т. Р. Викс // Российская империя в зарубежной историографии. Работы последних лет: Антология. – М., 2005. с. 589–609
23. Гомельский процесс. Подробный отчет, составленный Б.А. Кревером. – СПб.: Общественная польза, 1907. – 1204 с.
24. Довнар-Запольский, М.В. История Белоруссии / М.В.Довнар-Запольский. – Минск: Беларусь, 2005. – 680 с.
25. Долбилов, М.Д. Полонофобия и политика русификации в Северо-Западном крае империи в 1860-е гг. / М.Д.Долбилов // Образ врага. – М.: ОГИ, 2005. – С.127 – 174.
26. Канапацкая, З. І. Беларускія татары – удзельнікі вызваленчых паўстанняў (канец XVIII–XIX ст.) / // Весці БДПУ. – Серыя 2. Гісторыя. Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. Эканоміка. -2015. - №7. – С.49–51.
27. Каппелер, А.Россия – многонациональная империя / А. Каппелер. –М., “Традиция”–“Прогресс-Традиция”, 2000. – 344 с.
28. Капэлер, А. Двухсэнсоўнасці русіфікацыі / А. Капэлер // ARCHE-Пачатак.– 2005. – № 2 (36) – С. 42–47.
29. Кімель, Я. Яўрэйскае гарадское насельніцтва Бедарусі ў 1897 - 1926 гг. / Я.Кімель. – // Беларусіка-Albaruthenica. – Кн.4. – Мінск,1995. – С.89 - 92.
30. Кон, Н. Благословение на геноцид: Миф о всемирном заговоре евреев и "Протоколах сионских мудрецов" / Н. Кон. – М., Прогресс, 1990.
31. Курлов, П.Г. Гибель императорской России / П.Г. Курлов. – — М.: Современник, 1992. – 325с.
32. Мухлинский, А. Исследование о происхождении и состоянии литовских татар / А. Мухлинский. – СПб., 1857.
33. Самбук, С. М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века / С. М. Самбук; редактор В. П. Панютич; Академия наук БССР, Институт истории. – Минск : Наука и техника, 1980. – 221с.
34. Скир, А. Еврейская духовная культура в Беларуси / А. Скир. – Минск : Мастацкая літаратура, 1995. – 142 с.
35. Шыбека, З.В. Гарады Беларусі (60-я гады XIX - пачатак XX ста-годдзяў). / З.В. Шыбека. – Мінск,1997. – 320 с.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВЫВУЧАЕМАЙ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
З ІНШЫМІ ДЫСЦЫПЛІНАМІ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з вызначэннем даты і нумару пратакола) |
|---|---|---|---|
| Гісторыя Беларусі | Гісторыя Беларусі | | Рэкамендаваць да зацвярджэння вучэбную праграму ў прадстаўленым варыянце пратакол № ад 2017 г. |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |
| | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЯНЕННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ
на 2017/2018 вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змянені | На якой падставе |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры

гісторыі Беларусі (пратакол № ад )

Заг. кафедры
гісторыі Беларусі
к.г.н., дац. _______________ А.Р. Яшчанка
(подпіс)

ЗАЦВЯРДЖАЮ

Дэкан факультэта
д.г.н., дац. _______________ М.М. Мязга

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ